5 Ис 2344

Н. САКАЛОЎСКІ

# 8 ПЕСЕНЬ ДЛЯ ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЫ

ДВБ • МУЗСЕКТАР — МЕНСК • 1934

# СВЯТА ПЕРАМОГ

Словы ЯКІМОВІЧА. Музыка Н. САКАЛОЎСКАГА.




Песнямі гамоніць
Наш Совецкі край
Вуліцы сягодня,
Чырванню гарацъ.

Зіхацяць плакаты
На ўсіх дамох,
Мы святкуем свята
Слаўных перамог.

Дзень у дзень няспынна
Уперад мы ідзём,
Творым калектыўна
Новае жыццё.

Шмат яшчэ работы
Трэба нам канчаць,
З большаю ахвотай
Будзем працаваць.

5Нс 2344

# КАБ СССР

Словы П. БРОЎКІ. Музыка С. ПАЛОНСКАГА.




Б 48754

Каб СССР спакойна
Мог будаваць і жыць:
Чырвоны пагранічнік
Стаіць на мяжы...
Прыпеў...

У лясах непераходных,
Дзе толькі вые звер,—
Чырвоны пагранічнік
Вартуе СССР.
Прыпеў...

І ў стэпах несканчоных,
Дзе так вятры пяюць,—
Вартуе пагранічнік
Рэспубліку сваю.

Калі-ж узніме вораг
Па СССР агонь,—
Чырвоны пагранічнік
Адкіне яго.
Прыпеў...

Мы-ж не дамо рэспубліку,
Каб знішчыў газ,
І клікне пагранічнік
Пасобіць нас.
Прыпеў...

І будзем дружна разам
Мы ворага біць
За СССР сусветны
Без межаў і граніц

Прыпеў:

На морах, рэках, горах,
На кожнай мяжы
Вартуе пагранічнік
Свае рубяжы.

# У ЛАГЕРЫ

Словы **ЯКІМОВІЧА.** Музыка **Н. САКАЛОЎСКАГА.**




У калгасе „Праца“.
Між садоў, прысад
Размясціўся лагер
Юных акцябрат. (Два разы).

Колькі тут раздолля,
І які прастор:
Рэчка, луг квяцісты,
Ды шумлівы бор.

Сонца грэе шчыра—
Слаўная пара.
Тварыкі у дзетак
Радасцю гараць.

Песні і гамонка
Цэлы дзень звіняць,
Люба тут на сонцы
Загараць, гулять.

Добра адпачыўшы
Летняю парой,
Добра і вучыцца
Будзем мы зімой.

# ПІОНЕРАМ

Словы **Я. КОЛАСА.** Музыка **Н. САКАЛОЎСКАГА.**




Шлях паказан вам шырокі,
Шлях прасторны,
Светлы, зорны,—
Дык наперад цвёрдым крокам,
Шум вясенні, яснавокі.

Дзеці волі, дзеці буры!
Ваша ранне—бой, змаганне.
У Кастрычніцкай віхуры
Карані вашай натуры,
Быць гатовым дружна крочыць,
Сямімільна,
Звонка, шчыльна.

# НА МАГІЛЕ ПАРТЫЗАНА

Словы ЧАРОТА.

Музыка І. ЛЮБАНА.




На магіле партызана
Ладзяць сходку комуністы,
Шмат чаго тут расказалі
Пад спеў лісцяў залацістых.

Шмат чаго успаміналі
Пра паходы, пра змаганне...
Зоры ў золак патанулі...
Разышліся толькі раннем.

На магіле партызана
Комсамольцаў сход бурлівы.
Усе яны для тых адданы,
Праз каго жывуць шчасліва.

І клянуцца быць на варце
Дзён вялікай перамогі,
Ў барацьбе, ў сталёвым гарце
Не сыйсці з яе дарогі.

На магіле партызана
Сакаляты-піонеры.
Час мінулы ім нязнаны,
Але сказам яны вераць.

На магіле партызана
Акцябраты садзяць кветкі,
Пра магілу расказалі
Ім сягоння, малым дзеткам.

# ЧЫГУНКА

Словы Я. КОЛАСА. Музыка Н. САКАЛОЎСКАГА.




У два рады між палёў
Стройна рэйкі ляглі,
Рэжуць нетры лясоў,
Точуць зубы зямлі.

Дзе стралой ляцяць,
А дзе дужкай бягуць,
Цераз поле і гладзь
Смела рэчкі сякуць.

Эх! і быстры-ж твой гон.
Толькі пыхае дым,
За вагонам вагон
Мчыцца змеем ліхім.

Мчыцца ўдзень і ўноч.—
Толькі поле дрыжыць,
Так ні конь, ні алень,
Ні арол не ляціць.

# ЖНІВО Ў КАЛГАСЕ

Словы А. ЯКІМОВІЧА. Музыка Н. САКАЛОЎСКАГА.




Дзень стаіць пагодны—
Аніводнай хмаркі.
Па калгаснай ніве
Коціцца жняярка.

Роўную палоску
Следам высцілае.
Жыта ёй пакорна
Галаву схіляе.

Коні вараныя
Сыплюць дружнай паркай.
Весела, ахвотна,
Аж гудзіць жняярка.

Вяжуць дзеўкі жыта
Спелае, буйное.
Працаваць так лёгка
Дружнай грамадою.

Не баляць ім плечы,
І не ломіць спіну.
Замяняе працу
Цяжкую—машына.

Сноп за снопам зносяць
Піонеры з нівы.
Шчочкі зружавелі
У дзяцей шчаслівых.

# НА МАГІЛЕ ПАРТЫЗАНА

Словы ЧАРОТА. Музыка Н. САКАЛОЎСКАГА.




На магіле партызана
Ладзяць сходку комуністы,
Шмат чаго тут расказалі
Пад спеў лісцяў залацістых.

Шмат чаго успаміналі
Пра паходы, пра змаганне...
Зоры ў золак патанулі...
Разышліся толькі раннем.

На магіле партызана
Комсамольцаў сход бурлівы,
Усе яны для тых адданы,
Праз каго жывуць шчасліва.

І клянуцца быць на варце
Дзён вялікай перамогі,
У барацьбе, ў сталёвым гарце
Не сыйсці з яе дарогі.

На магіле партызана
Сакалята піонеры.
Час мінулы ім нязнаны,
Але сказам яны вераць.

На магіле партызана
Акцябраты садзяць кветкі,
Пра магілу расказалі
Ім сягоння, малым дзеткам.

ЦАНА 20 кап.

1934

V2003г

B000000 14 12469

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя В. І. Леніна

*НА РУССКОМ ЯЗЫКЕ*

Н. Соколовский

8 ПЕСЕН

ГОСУДАРСТВЕННОЕ
ИЗДАТЕЛЬСТВО
БЕЛОРУССИИ

МИНСК—1934

Школа ФЗВ друкарні імя Сталіна. Зак. № 634. 7000 экз. Уп. Галоўлітбела № 1481